View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# "Дзённікі" Максіма Танка: экзістэнцыяльны кампанент

На сённяшнім этапе гістарычнага развіцця ўзрастае роля аўтабіяграфічнай прозы як своеасаблівай "мікрамадэлі культуры" (Ніколіна), якая фіксуе важныя этапы самарэалізацыі асобы. Вобраз жыццёвага шляху, дарогі да самога сябе, адкрыццё ўласнай індывідуальнасці аказваецца аднолькава важным і для дакументальных жанраў, і для мастацкіх тэкстаў. Біяграфічная проза "адлюстроўвае паслядоўнасць адкрыцця індывідуальнага "я" праз яго адносіны да другіх і да свету" (7, с.9). Вобраз аўтара, роля "личностных" аспектаў яго культуры, працэс станаўлення ўнутранага свету мастака — цікавы аспект вывучэння індывідуальных своеасаблівасцей пісьменніцкага стылю, аўтарскай філасофіі, творчага патэнцыялу майстра слова.

Аўтабіяграфічны жанр прываблівае дакладнай інфармаванасцю аўтара аб падзеях, сведкам і ўдзельнікам якіх ён з"яўляецца, максімальнай яго зацікаўленасцю ў фіксацыі знешняга жыцця і асабліва ўнутранага светаадчування, сцвярджэннем сваёй праваты, сваіх асобасных ацэнак і высноў. Жанр дзённіка бадай што самы інтымны жанр з усёй аўтабіяграфічнай прозы: споведзяў, хронік, мемуараў, аўтабіяграфій, запісак, успамінаў, якія ў той ці іншай ступені заўсёды скіраваны да чытача.

У сучасных лінгвістычных даследаваннях (працах Н.Аруцюнавай, Х.Лінка, У.Эко) існуе думка, што любы тэкст (мастацкі ці дакументальны) мае свайго "абстрактнага альбо імпліцытнага чытача". У.Эко піша: "Текст есть не что иное, как семантико-прагматическая продукция своего образцового читателя" (9, с.3) Таму нават такі інтымны жанр як дзённік "предполагает фактор адресата", хай сабе і ўмоўнага, што абавязвае мастака прытрымлівацца адпаведнага стылю і манеры аповяду.

"Дзённікі" Максіма Танка — гэта гісторыя станаўлення асобы, гісторыя асабістага духоўнага жыцця, гэта дакумент аб сваёй эпосе і сваім часе. І калі аўтар мужна гаворыць пра сябе нават рэчы малапрыемныя, агаляе жахлівую праўду, то дзённік ператвараецца ў магутны дакумент свайго часу, накшталт "Confessions" Ж.Ж.Русо.

Мэта рэалістычнага дзённіка, менавіта такімі і з"яўляюцца запісы Максіма Танка, — аб"ектыўна расказаць пра свае сувязі са светам у іх шматаспектнасці, паказаць сябе як асобу, якая асвойвае свет, і як свет адаптуе яе да сябе. Безумоўна, гэты аспект праблемы цікавы для вывучэння, і тут ўжо ёсць напрацоўкі беларускіх вучоных. Я хацела б прапанаваць іншы ракурс даследавання праблемы — экзістэнцыяльны. Гэта значыць вызначыць маштаб і характар трансфармацыі ўнутранага "я" пісьменніка і прасачыць за працэсам яго самарэалізацыі ў свеце людзей.

Як слушна заўважыў у свой час Мікалай Бердзяеў: "В познании о себе самом человек приобщается к тайнам, неведомым в отношении к другим… Личность человеческая более таинственна, чем мир. Она и есть целый мир.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Человек — микрокосмос и заключает в себе все. Но актуализировано и оформлено в его личности лишь индивидуально-особенное" (4, с.8)

У "Дзённіках" Максіма Танка мы бачым гісторыю індывідуальнага жыцця чалавека, асобы, мастака. Пісьменнік, па трапнаму выказванню французкага філолага Гюсдорфа, "ствараючы тэкст, ствараецца сам" (10, с.13). Міхаіл Бахцін, распрацоўваючы тэму "Античная біяграфія і аўтабіяграфія", зазначае, што аўтабіяграфічны тэкст — "это новое отношение к себе самому, к собственному "я", без свидетелей, без предоставления права голоса "третьему", кто бы он ни был. Самосознание одинокого человека ищет здесь опору и высшую судебную инстанцию в себе самом и непосредственно в идейной сфере — в философии" (3, с.73). Бахцін яе называе яшчэ "філасофія-суцяшальніца".

Аўтар "Дзённікаў" выступае як творца вобраза ўласнага "я", прадстаўляе яго іншым і, як правіла, з"яўляецца станоўчым героем, што і вызначае аўтарытэтнасць яго ацэнак і меркаванняў. Спасціжэнне самога сябе, на думку Бердзяева, "есть творческий акт, совершаемый в мгновении настоящего. Ценность этого акта определяется тем, насколько он возвышается над временем, приобщается ко времени экзистенциальному, т(о) е(сть) к вечности" (4, с.8). Але самапазнанне не можа адбыцца па-за гістарычным часам.

На фарміраванне вобраза ўласнага "я" ў гістарычным часе працуюць вобразы блізкіх да пісьменніка людзей: родзічаў, сяброў, калег па працы. Пісьменніцкая ацэнка гэтых асоб, а таксама гістарычных сітуацый, прачытаных кніг, твораў мастацтва з"яўляецца выразным сродкам самахарактарыстыкі, выяўляе індывідуальныя якасці асобы. Міхаіл Бахцін у трактаце "К философии поступка" пісаў: "Каждая мысль моя с ее содержанием есть индивидуально-ответственный поступок, один из поступков, из которых слагается вся моя единственная жизнь как сплошное поступление; *я поступаю всею своею жизнью, каждый отдельный акт и переживание есть момент моей жизни-поступления*" (2, с.83). Такім чынам, самыя нязначныя на першы погляд выказвані аўтара, удзел/неўдзел у нейкіх падзеях — гэта цэлая "сістэма матываў" (Бахцін).

З сярэдзіны 80-х гадоў у "Дзённіках" Максіма Танка адчуальна ўзмацняецца ўвага да свайго ўнутранага жыцця. Побач са станоўчай самаацэнкай і часам нават з пэўнай ідэалізацыяй свайго "я" ў аўтабіяграфічным тэксце ў цэлым захоўваецца "прынцып сціпласці" (Н.Ніколіна), які вымагае адмовіцца ад прамога самазахаплення, а значыць абмяжоўвае ўжыванне ў тэкце станоўчых ацэначных выказванняў, якія маюць дачыненне да суб"екта. "Увеличение положительных самооценок и тем более их повторяемость воспринимаются как нарушение некой повествовательной (точнее этической (падкрэслена мной --Т.Т.) нормы жанра " (7, с.251).

Гэтым жа прынцыпам кіруецца і Максім Танк, каб не выклікаць у чытача трансфармацыю ўласнага "я" з асобы станоўчай у "паразітычную", схільную да самападману і самаўзвелічэння. Мастак не баіцца прызнавацца ў сваіх адмоўных якасцях, у негатыўных ацэнках уласных учынкаў, іранічным стаўленні да творчых пошукаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У "Дзённіках" за 1986 год чытаем: "Засумаваў па добрых вершах, і сам іх развучыўся пісаць" (Полымя,1997.№9. С.77). "За апошнія дні нічога не змог напісаць. Зацягнуўся мой творчы крызіс" (Полымя.1997.№9. С.84). 1987 год: "Узяўся за свае вершы. Сумна. Здаецца ніколі не пісаў так дрэнна" (Полымя.1997.№9. С.93). 1989 год: "Калі не спіцца, думаю аб вершах. Я ведаю аб сваіх недахопах больш, як усе мае крытыкі, таму што бачу вяршыні паэзіі, але да іх ніяк не дайду" (Полымя.1997. №10.С. 167). 1993 год: "А ў мяне зараз адны няўдачы, адны трывогі. Губляю ўсякую ўпэўненасць у неабходнасці свайго жыцця і творчасці" (Полымя.1997. №11. С.144). 1994 год: "Адчуваю, што ўвайшоў у самы цяжкі перыяд свайго жыцця — перыяд паражэнняў творчых, маральных, жыццёвых. Цяпер ужо позна на ўсім ставіць кропку. Застаецца толькі прайсці праз усе пякельныя кругі" (Полымя.1997. №12. С.117).

Сучасная аўтабіяграфічная проза мае ўстойлівую тэндэнцыю да самаагалення. Прынцып "шчырага" прызнання ў благіх учынках, крамольных думках, глыбінны псіхааналіз як метад спасціжэння ўнутранага свету "я" пазбаўляюць сучасную аўтабіяграфію табуіруемых тэм, паступова пашыраюць сферы духоўнага жыцця "я". У "Дзённіках" беларускага пісьменніка паступова раскрываецца ўся складанасць чалавечага "я"-асобы. Увага да падрабязнасцей душэўных пакут, так уласцівая рускай класічнай традыцыі і лепшым узорам беларускай прозы ХХ стагоддзя, у запісах Максіма Танка набывае трагічнае гучанне. "Пры ўсім аптымізме, мяне чамусьці не пакідае трагізм існавання" (Полымя. 1996. №9. С.201). "Ці варта трымацца за жыццё, каб толькі жыць?" (Полымя.1997. №10. С.148). "Трагізм жыцця ўсё часцей непакоіць мяне" (Полымя.1997. №10. С.164).

Унутранае жыццё мастака, глыбокае і невычэрпнае, уяўляе сабой плынь, ацэнкі пісьменніка рухомыя, недагматычныя, а вобраз паэта паўстае як вобраз чалавека разумнага, уважлівага, пачуццёвага, які ўвесь час у творчых і жыццёвых пошуках. Паглыблены самааналіз ідзе ад пакутлівага ўсведамлення зменлівага і супярэчлівага жыцця душы ў пошуках ісціны і знешняй рэчаіснасці, у якой многа нестабільнасці, цякучасці, хуткаплыннасці. "Дзённікі" даюць права гаварыць аб семантычнай множнасці "я": "я" унутранага і знешняга, "я" духоўнага і эмпірычнага, "я" ў мінулым і "я" ў цяперашнім часе. Такім чынам, у дакументальных занатоўках Максіма Танка мы бачым ускладненую семантыку "я".

Важным кампанентам самахарактарыстыкі і самаідэнтыфікацыі асобы служыць інтэртэкст. У "Дзённіках" беларускага пісьменніка дамінуюць так званыя прэтэксты (урыўкі з мастацкіх твораў). Крыніцы інтэртэксту самыя розныя — гэта творы беларускага і сусветнага фальклору ("Успомніў пагаворку свайго дзеда: "Калі конь не цягне, пугай сцябай не каня, а сябе" (Полымя.1997.№10. С.145); народная прыказка: "Нічым так справядліва на свеце не надзяліў Бог людзей, як розумам, бо кожны лічыць, што ён мае яго досыць" (Полымя.1997.№10. С.147); кітайская прымаўка: "Куды цябе запрашаюць — прыходзь рэдка, куды не запрашаюць —не прыходзь зусім" (Полымя.1997 №9. С.77), урыўкі з выказванняў класікаў замежнай літаратуры (Ж.Ж.Русо: "Калі не можаце ўратавацца, каб вас не зжэрлі, пастарайцеся хоць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каб вас не пераварылі" (Полымя.1997. №10. С.167). А.Споэрль: "Погляд, што мужчына не можа кахаць адну і тую ж кабету, такі ж фальшывы, як погляд, што скрыпач, каб адыграць той самы твор, мусіць мець некалькі інструментаў" (Полымя.1997. №10. С.148). У "Дзённіках" змешчаны накіды ўласных вершаў і вершы сяброў па пяру.

Інтэртэксты выяўляюць літаратурныя густы самога Танка, яго калег, знаёмых, ствараюць каларытны вобраз эпохі і служаць спосабам аўтарскай ацэнкі іншых асоб, важным складнікам працэсу фарміравання асобы пісьменніка, яе самахарактарыстыкі. "Трэба было б да свята купіць пару бутэлек шампанскага. "Што за жыццё, у якім няма віна",— гаварыў мудрэц Саламон. Праўда, ён зазначыў, што яго піць трэба з пачуццём меры і ў адпаведны час. Толькі хто ў нас ведае гэту меру і гэты час? А ўсе забароны на спіртное пакуль што прыносілі яшчэ большую шкоду і страты і не спынялі п"янства" (Полымя.1997.№10. С.149). Які дакладны, інтанацыйна багаты ўрывак! І які маштаб асацыятыўнага мыслення! Танк тут паўстае перад чытачом як мудрэц-філосаф.

У запісах шмат сустракаецца цытат з Бібліі, яны фарміруюць у тэмпаральнай структуры "Дзённікаў" план вечнага, які супрацьпастаўлены часоваму, тленнаму, зямному, і аповяд становіцца больш аб"ёмным. Біблейскія ўрыўкі — "формула генерацыі" (Ніколіна) аўтарскіх перажыванняў, ацэнак, эмоцый, аўтарскай філасофіі і нават філасофіі цэлага пакалення. Зварот да міфалагічных вытокаў абумоўлены не толькі пошукам крыніц вобразнасці, гэта яшчэ і схема, якая мадэлюе самасвядомасць і працэс пазнання чалавекам свету.

У канцы 80-х гадоў XX ст. інтанацыі ў "Дзённіках" мяняюцца: балючае адчуванне крызіснасці жыцця, душэўныя пакуты, прадчуванне завершанасці зямнога быцця выклікаюць мінорны настрой, абвостранае адчуванне Часу як галоўнага Суддзі, які развражыць, ацэніць, захавае альбо адправіць у нябыт. Напрыканцы жыцця Максім Танк выразна ўсведамляе, што "жыццё — драма", пра гэта сведчаць два апошнія зборнікі паэта "Мой каўчэг" і "Errata". У лютым 1994 года мастак пакінуў такі запіс у дзённіку: "Калісьці людзі майго пакалення часы свае называлі часамі пагарды. Зараз мы ўступілі ў часы адчалавечання. І хоць, здавалася б, з нацыянальным адраджэннем, вяртаннем да рэлігіі павінна б было наступіць маральнае і духоўнае аднаўленне, на вялікі жаль, мы гэтага не бачым" (Полымя.1997.№12, с.81). Няспынны пошук цэласнасці асобы, унутранай гармоніі, "пафас пакутлівай барацьбы за выздараўленне, за пабудову недабудаванага "я", па словах Аверынцэва, "противостоит как благодушным иллюзиям наличности искомого, так и нигилизму" (1, с.132).

Расказ пісьменніка аб сваім мінулым у 90-я гады мінулага стагоддзя дапаўняецца споведдзю, у якой мы назіраем павелічэнне, як трапна зазначыў М.Бахцін, "удельного веса событий интимно-личной жизни, (…), которые при громадном значении в личной жизни данного человека имеют ничтожное значение для других и почти вовсе не имеют социально-политического значения" (3, с.73). Але "всякая жизнь интересна; не личность — так среда, страна занимают, **жизнь** (выд. Герцэнам) занимает",— піша Герцэн у рамане "Былое и думы" (5, с. 461).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Танкаўскае адчуванне непаўторнасці, самакаштоўнасці кожнага факта, падзеі, жыццёвай сітуацыі і падштурхнула яго да напісання "Дзённікаў". У запісах за 1951 год чытаем: "Дзённік патрэбен мне для маёй працы. Гэта — не магільнік маіх думак і пачуццяў, куды рэдка заглядае і сам пісьменнік, гэта — шлях з верставымі слупамі-паказальнікамі" (Полымя. 1996. №9. С.186). 1971 год: "Дзённік мой становіцца нястомным субяседнікам, якога магу разбудзіць у любы час ночы і працягваць бяседу — весці гэтыя хаатычныя запісы" (Полымя. 1997. №3. С.160).

Важнай уласцівасцю аўтабіяграфічнага твора Максіма Танка з"яўляецца яго адкрытая суб"ектыўнасць і характэрная ёй экспрэсіўная накіраванасць. Пісьменнік не хавае ўласных пачуццяў закінутасці, адчужанасці, неабароненасці перад маштабам сацыяльных зрухаў. Будучы чалавекам сацыяльна актыўным, мастак імкнуўся захаваць сябе як творцу. У "Дзённіках" мы чытаем: "Засядаю і засядаю. Прападзі ты пропадам такая работа! (Полымя. 1996. №12. С.200). "… Выступленні, прыёмы. Мы зусім забылі, што аб нашых поспехах будуць судзіць не па колькасці з"ездаў, пленумаў, вечароў, а па творах. І толькі па творах" (Полымя. 1996. №11. С.196). "Амаль усё жыццё прайшло на розных паслугах і дамашняй мітусні" (Полымя. 1997. №9. С.79). "… творчая праца патрабуе часу, часу і часу, адзіноцтва, адзіноцтва і адзіноцтва. А ў мяне на працягу ўсяго жыцця не хапала ні таго, ні другога" (Полымя. 1997. №3. С.187).

Адзінота — абавязковая ўмова для творчасці. Здольнасць да адзіноты — паказчык самакаштоўнасці асобы, умова захавання яе ўнутранага свету. Праз адзіноту адкрываецца шлях да людзей. Адзінота — не супрацьстаянне асобы і грамадства, "одиночество,— як зазначае расійскі даследчык Валянціна Заманская, — это совершенно необходимое условие для самоуглубления личности. Для самопознания, для определения ее ценности: вне одиночества нет поэта. И более того, мера одиночества, как ни парадоксально, способность к самоуглублению через одиночество — порой и показатель самоценности личности поэта, и показатель меры его таланта" (6, с.175).

Антаганічнае пачуццё адзіноты ідзе ад вострага адчування паэтам неабходнасці правільна суаднесці міг і вечнасць, спасцігнуць кошт імгнення і чалавечага жыцця. "Дзённікі" ёсць матэрыялізаваная ідэя завершанасці кола зямнога быцця, незваротнасці часу і чалавека ў ім.

Літаратура:

1. Аверинцев С. "Аналитическая психология" К.-Г.Юнга и закономерности творческой фантазии //Вопросы литературы. 1971, №4.
2. Бахтин М.М. К философии поступка //Философия и социология науки и техники: Ежегодник. 1984 — 1985. М., 1986. С.80 — 160.
3. Бахтин М.М. Эпос и роман. — СПб.: Азбука, 2000.— 304 с.
4. Бердяев Н.А. Самопознание. М.: Книга, 1991. — 445 с.
5. Герцен А. И. "Былое и думы". Ч.1 — 5.— М.: Худ. лит., 1987.— 671 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Заманская В.В. Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века. Диалоги на границах столетий: Учебное пособие. — М.: Флинта: Наука, 2002. — 304 с.
7. Николина Н.А. Поэтика русской автобиографической прозы: Учебное пособие. — М.: Флинта: Наука, 2002. — 424 с.
8. Танк Максім. Дзённікі. — Полымя. 1996. № 9—12; 1997. № 1—12.
9. Eco U. The role of the reader. London, 1979.
10. Gusdorf G. Conditions et limites de autobiografie // Formen der Selbdarstellung. Berlin, 1965.


Закончыць сваё выступленне я хачу словамі італьянскага пісьменніка-філосафа У.Эко: "… текст — механизм ленивый, требующий, чтобы читатель выполнял за него львиную долю работы." (с.52)

"Любое чтение — проверка себя на способность прислушаться к недоговоренным подсказкам" (с.210)

Я паспрабавала расшыфраваць гэты лянівы механізм, прыслухаўшыся да схаваных падказак Максіма Танка ў "Дзённіках".

"Творчасць — такая ж інтымная справа, як любоў і смерць. Не тактычна бездарна расказваць пра яе". (Полымя. 1997. №9. С.74) "Не знаю, як цешыцца: на некалькі дзён застаюся са сваімі думкамі. А то кожны дзень — госці". (Полымя. 1997. №9. С.97) "Не люблю я святочнай мітусні. Здаецца, каб яе перачакаць, забіўся б у нейкі глухі куток з пяром ці з кнігай у руках." (Полымя. 1997. №9. С.103)

1950 г.: "Цікава, што мяне часта наведвае пачуццё адзіноцтва. Адкуль яно?" (Полымя. 1996. №9. С.184)

1967 г.: "Забыўся, калі пісаў вершы. Хутка забуду, як іх пісаць. Часта гаворым аб стварэнні лепшых умоў для працы. Але на сапраўдную працу амаль не застаецца часу, які мы так не па-гаспадарску марнуем. А пра гэта разумныя людзі клапаціліся даўно. Яшчэ ў XVII веку ў дыпломе караля Зыгмунта III, выданым Шыману Шыманоўскаму, сказана: "Наколькі такім дасканалым з"яўляецца паэтычнае мастацтва, што патрабуе адыходу ад іншых занятка ў у пошуках высокай самотнасці — мы, беручы пад крыло спецыяльнай нашай ласкі, дазваляем яму ў любой правінцыі, горадзе прыдбаць грамаднае права з карыстаннем прывілеяў і свабод, і звальняем яго ад абавязкаў і цяжару як мірнага, так і ваеннага часу, каб не толькі сам жыў свабодна, але і дом яго, які лічым прыстанішчам святых муз, — свабодны быў ад усякага шуму, звальняем яго ад абавязку прадстаўлення для пастою і ўсім, хто ўзначальвае гэтыя справы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

напамінаем, каб спакою паэта нішто не парушала".(Полымя. 1996. №12. С.201-202)

Паэт адчувае сваю адказнасць за чалавецтва, "атручанае маральна і псіхічна хворае."(Танк.1997. №10. С.172)

У Максіма Танка лірычная экспрэсія ўзаемадзейнічае з іранічнай. Лірычная экспрэсія скіроўвае чытача на благасклонность аўтара да прадмета аповяду альбо ўказвае на сітуацыю істотную для аўтара, у той час як іранічная экспрэсія указвае на несупадзенне ацэнак у мінулым і цяперашнім часе.

Вобраз "я"-пісьменніка,-асобы завершаны і цалкам аўтаномны мікракосмас. І па гэтай прычыне ён цалкам раўнапраўны з макракосмасам.

Вобразная характарыстыка "я" пашыраецца за кошт рэмінісцэнцый, аўтацытат, выкарыстання міфалагічных вобразаў, якія сведчаць аб эвалюцыі аўтарскага ўяўлення аб самім сабе, аб навакольным свеце, аб уласным жыццёвым шляху.

Назва "Дзённікі" мае і сэнсавую, і жанравую скіраванасць. Гэта — аповяд пра самога сябе, гісторыя індывідуальнага жыцця, рэтраспектыўная арганізацыя аповяду, ідэнтычнасць аўтара і апавядальніка.

У Максіма Танка назва твора перш за ўсё скіроўвае на жанравую прыналежнасць аўтабіяграфічнага тэксту і асаблівасць яго кампазіцыйнай арганізацыі. Эмацыянальна-ацэначны кампанент у назве адсутнічае.

Лексічным і фразеалагічным адзінкам уласцівы характаралагічныя функцыі: яны характаразуюць асобу, пра якую ідзе гаворка, асяроддзе, час.

XX стагоддзе канчаткова зняло праблему, хто мае права пісаць аўтабіяграфічны твор. А.І.Герцен у знакамітым творы "Былое і думы" задаецца пытаннем:

— Кто имеет право писать воспоминания?

— **Всякий** (выд. Герценом).

Асабістыя ўспаміны, ацэнкі выступаюць як сродак самапазнання. Спалучэнне двух часавых планаў мінулага і цяперашняга, дакладней, іх "адчужэнне"…..

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Танк фіксуе снобачанні — гэта мастакоўскае адчуванне касмаганічнай сітуацыі, калі цалкам знікае мяжа паміж мікракосмасам чалавечай свядомасці і макракосмасам Сусвету ці нават іншымі часавымі сістэмамі.

1952 г.: "К.Д.Фрыдрых гаварыў: "Мастак павінен малявацьне толькі тое, што бачыць перад сабой, але і тое, што бачыць у сабе, а калі нічога не бачыць у сабе, павінен перастаць маляваць тое, што бачыць перад сабой". Гэта, мне здаецца, можна сказаць і пра пісьменніка.

1943 г.: "Чамусьці Аркадзь зноў раіў мне не весці ніякага дзённіка." (Полымя. 1996. №9. С.163)

1946 г.: "Закінуў свой дзённік. Не ведаю, ці варта мне да яго і вяртацца"(Полымя. 1996. №9. С.171)

1956 г.: "Я даўно сумняваюся ў тым, што можа існаваць толькі адзін метад раскрыцця, адлюстравання жыцця — метад сацыялістычнага рэалізму. Хоць пакуль што ўсе мы гэтаму богу клянёмся ў любові і на яго алтар складаем свае ахвяры"(Полымя. 1996. №9. С.231)

Павялічылася колькасць рытарычных пытанняў, усё часцей мастак ставіць шматкроп"е. У сістэме экзістэнцыяльных каардынат гэта называецца "матывам маўчання", недагаворвання

1962 г.: "Цікавае выказванне знайшоў у Рэнуара: "Калі б можна было растлумачыць вобраз, не былоб мастацтва".(Полымя. 1996. №11. С.172)

**У.Эко. Шесть прогулок в литературных лесах. — СПб.: "Симпозиум", 2002. — 285 с.**

"… текст — механизм ленивый, требующий, чтобы читатель выполнял за него львиную долю работы." (с.52)

"Основополагающее правило обращения с литературным текстом заключается в следующем: читатель должен соблюдать негласное соглашение, которое Кольридж определил как "воздержание от недоверия" (с.139)

"Любое чтение — проверка себя на способность прислушаться к недоговоренным подсказкам" (с.210)

Янка Брыль. "Свае старонкі". "…Ўзяўся чытаць брылёўскія "Свае старонкі". Чытаю і радуюся, што ў нас ёсць такі мастак-пісьменнік. Фрагменты яго біяграфіі, насычаныя роздумам, болем, перажытымі пакутамі і трывогамі, запаўняюць многія прабелы, якія адчуваліся і яшчэ адчуваюцца ў нашай беларускай літаратуры…" (М.Танк. Полымя, 1997.№12.С.72)

Дзённік Б.Мікуліча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ